№ 44 (349)
Лістапад 2010 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

☞ Асоба ў краязнаўстве: *лекар-краязнавец Корнеў* – *стар. 2*

☞ Традыцыі: *далучэнне моладзі да каранёў* – *стар. 3*

☞ Радавод: *міністр граф Старжынскі* – *стар. 7*

У калажы скарыстаныя фота Сяргея ПАНІЗЬНІКА і карціна Аксаны АРАКЧЭЕВАЙ

Публікацыі, прымеркаваныя да юбілею, глядзіце на старонках 4–6

Зорка першай велічыні

26 лістапада – 80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча – геніяльнага творцы, чалавека ўсебакова адоранага – празаіка, паэта, драматурга, публіцыста і... мастака (і фотамастака). Да юбілейнай даты ў мінскай бібліятэцы № 1 імя Л. Талстога 19 лістапада адкрылася мастацкая выстаўка «Зорка Уладзіміра Караткевіча», у рамках якой былі падрыхтаваныя кніжныя выстаўкі, дзе прадстаўленыя творы і матэрыялы пра жыццё і творчасць таленавітага пісьменніка і малюнкі самога Караткевіча. На выставе змешчаныя ілюстрацыі да яго твораў і партрэты класіка, створаныя знакамітымі мастакамі – Арленам Кашкурэвічам, Міхасём Басалыгам, Генадзем Гракам, Раісай Сіплевіч, а таксама больш маладымі мастакамі Аксанай Аракчэевай і Андрэем Ясінскім.

Ва ўрачыстым адкрыцці выстаўкі прынялі ўдзел Анатоль Верабей, Вячаслаў Рагойша, Адам Мальдзіс, Аксана Аракчэева, Андрэй Ясінскі і інш. Караткевічазнаўца А. Верабей узгадаў: «Гэта яркая, непаўторная постаць. Памятаецца, у 1952 годзе ён рабіў вандроўку на радзіму Янкі Купалы ў Вязынку і пакінуў там у кнізе наведнікаў такі запіс: *«Адсюль сышоў я чалавекам, каб узысці на Беларусі зоркай першай велічыні»*. Дык вось, Уладзімір Караткевіч – зорка першай велічыні. Ён арыгінальны і непаўторны як паэт, як празаік, як драматург, публіцыст, які марыў напісаць 100 тамоў пра гісторыю беларускага народа».

В. Рагойша ўспомніў пра сваё знаёмства і сяброўства з Уладзімірам Караткевічам, распавёў пра ўручэнне «Дыплёма» (пра яго падрабязна расказала «Краязнаўчая газета» ў №№ 41–42) ды так ахарактарызаваў малюнкі Уладзіміра Караткевіча: *«Некалькі штрыхоў – вось яго здольнасці мастака. Некалькі асаблівых штрыхоў: лоб з вялікай залысінай і нос, на носе "акуляраў зломак", як пісаў А. Лойка, больш нічога, і адразу відаць – гэта прафесар Лойка... Дарэчы, Караткевіч быў выдатным фатографам. Калі яго жонка Валянціна Браніславаўна ўзначальвала ў Акадэміі навук сектар па выданні "Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі", яны часта ездзілі па краіне. І Караткевіч фатаграфаваў усе гэтыя аб'екты. Ён быў фатограф-мастак, умеў выбраць пэўны аб'ект, пэўны ракурс, каб была перспектыва і г.д.»*. В. Рагойша прапанаваў (акрамя 25-томнага Збору твораў, які будзе выходзіць з наступнага года) асобна выдаць альбом фотаздымкаў і альбом малюнкаў У. Караткевіча, каб мы бачылі яго рознабаковасць, яго таленавітасць, яго геніяльнасць.

А пра незвычайны партрэт У. Караткевіча, які адкрывае выстаўку, распавяла мастачка Аксана Аракчэева: *«Пісаць партрэт – вялікая адказнасць. Я рыхтавалася да гэтага моманту і сёлета наведала ў Оршы музей Караткевіча, каб паглядзець, якія партрэты ўжо створаныя. Хацелася сваё нешта адшукаць, і калі перачытвала пісьменніка, трапіла на верш "Заяц варыць піва". Аўтар – чалавек вясёлы, цікавы, паважаў жарт. Таму я напісала яго маладым і вясёлым»*.

Выстаўка будзе доўжыцца да 31 снежня.

Алесь САЧАНКА

Новая кніга БФК

У выдавецтве «Беларускі фонд культуры» (па ініцыятыве Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, пры падтрымцы Беларускага камітэта ІКАМОС і прыватнага прадпрыемства «Неф-праект») выйшла ўнікальная кніга – аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» на беларускай, украінскай, рускай і англійскай мовах. Падарункавае выданне, праілюстраванае малюнкамі Юрыя Якавенкі, прымеркаванае да 80-годдзя класіка.

У дзень здачы «Краязнаўчай газеты» ў друкарню прэзентацыя новай кнігі прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. На радзіме пісьменніка прадстаўленне выдання запланаванае на 26 лістапада.



Асоба ў краязнаўстве

Мядовы полюс Алеся Корнева

Першая кніга лірыкі Алеся Корнева пабачыла свет у 2001 г. і мела назву «Услед за ластаўкай». А нядаўна ў Брэсце быў выдадзены 14-ты зборнік паэзіі «Як песня, як год мінае». Сам ён называе зборнік «сентыментальная паэма».

У прамове да выдання паэт з Мінска Яўген Гучок адзначыў: *«Па адукацыі, па прафесіі А. Корнеў – урач. Больш трох дзясяткаў гадоў ён адпрацаваў загадчыкам дыспансернага аддзялення Баранавіцкага скурна-венералагічнага дыспансера. Бяру на сябе смеласць заявіць, што зыходзячы з гэтага інфармацыйнага дыскурсу, яго паэзія мае здольнасць лячыць і такую хваробу чалавечай душы, як шкурніцтва».*

Вядомы Алесь Корнеў і як мастак, у Баранавічах ён зладзіў некалькі персанальных выставак.

А нас ён найбольш цікавіць як падарожнік і краязнаўца. Пехатою, на легкавіках, аўтобусах, цягніках, з пяром і працоўным сшыткам вандруе гэты чалавек па Беларусі. Яго шляхі пралеглі праз Мінск, Брэст, Зэльву, Узду, Ганцавічы, Пружаны, Бярозу, Жабінку, Лунінец... І праз мала каму вядомыя вёскі Галынка (дзе гасцяваў і вывучаў працу народнага самабытнага ганчара Сяргея Худзяева), Лінёва (падарожнічаў разам з даследчыкам мінуўшчыны, пчаляром і паэтам Міколам Папекам), Аранчыцы (былі гутаркі са знаўцам народнага жыцця Васілём Казлоўскім).

Нарадзіўся Алесь Касьянавіч Корнеў 30 лістапада 1935 г. у прыгарадзе Магілёва – Лупалаве. У 1954 г. скончыў Малахоўскую сярэднюю школу, у 1960 – Мінскі медінстытут, працаваў урачом у Мазыры і Баранавічах. З дзяцінства любіў чытаць, меў замілаванне ад паэзіі, захапляўся маляваннем, тонка адчуваў прыроду... Ды сур'ёзна займацца паэзіяй пачаў гадоў дзесяць таму. Тады ж прыйшла да яго і цяга да краязнаўства.

Адметнымі, красамоўнымі краязнаўчымі паэтычнымі кнігамі, на мой погляд, з'яўляюцца тры – «Крыжы зямелькі нашай» (2004), «Праз міфы і легенды» (2004) і «Мядовы полюс» (2010). У першай з іх А. Корнеў вызначыўся:

Пакідайце свой край
густа потам паліты! (...)

А я тут, дзе жыву,
да канца застаюся,
Дзе ўвабраў пах зямлі
і душою, і рэбрамі,
Бо мой лёс –
гэта доля маёй Беларусі
З усім болем яе
і з усімі патрэбамі.



Аўтар запрашае нас у Старобін, на Авідзевы ўзвышшы, з якімі звязана нямала мясцовых легендаў. Звяртаецца да паланёнай Рагнеды, святой Ефрасінні Полацкай, майстра Лазара Богшы, згадвае Міндоўга з яго Варутай, Кейстута, Вітаўта, Ягайлу ды іншыя асобы.

У зборніку таксама праходзіць, красуе бязмежжа вялікіх гістарычных беларускіх постацяў (Сымон Будны, Казімір Лышчынскі, Саламея Русецкая, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Валянцін Таўлай, Канстанцыя Буйло, Наталля Арсеннева). І дзякуючы Корневу кожная з іх ажывае і пачынае абуджаць твае найлепшыя маральныя якасці.

У 2002 г. выйшла першая мая кніжка «Ці завіталі антычныя дзеячы на Палессе». А ў 2004 г. на яе адгукнуўся Алесь Корнеў – кнігай «Праз міфы і легенды», дзе паэтычна ў «Палескіх легендах» павёў размову пра падарожжа Герадота па нашай зямлі і знакаміты расповед гісторыка пра белых коней Палесся (згадайма караткевічаўскіх дрыгантаў)...

Не абыходзіць Алесь Корнеў сваёй увагай ды павагай і веру нашых продкаў у Даждджбога, Белуна, Перуна, Ярылу, Жыценя, Зюзю, Жыжаля, Лялю, Вялеса:

Чаго спевакі, вешчуны і паэты
Не кінулі ўсё-ткі
ўзбуджаных струн?
Бо помняць, шануюць
пакуль запаветы
Вялеса, а ён – іхні бог-апякун.

Зборнік «Мядовы полюс» у асноўным мае адносіны да Пружанаў, а паэма «Мядовыя мары і чары» ў гэтым выданні прысвечаная Міколу Папеку – пчаляру і паэту, мецэнату і даследчыку, заснавальніку штогадовай прэміі для пісьменнікаў Брэсцкай вобласці за дасягненні ў літаратуры. Дарэчы, атрымаў гэтую ж прэмію і сам Алесь Корнеў.

Зайздросны і павучальны творчы лёс нашага юбіляра! І мы зычым яму шчасця, здароўя і новых здабыткаў у краязнаўстве, паэзіі, жывапісе – у жыцці!

Міхась МАЛІНОЎСКІ,
правадзейны член
Геаграфічнага
таварыства,
г. Баранавічы

Жалуды мінулага

Нядаўна ў сваіх чарговых маналогах пад назвай «Заверанела» галоўны рэдактар газеты «Ляхавіцкі веснік» В. Барадзіна выказала ідэю пра захаванне для нашчадкаў памяці аб вядомай польскай пісьменніцы Элізе Ажэшка. Пра сувязь яе з Ляхавіччынай сведчыць дуб, які яна пасадзіла ў 1909 годзе ў Флер'янове (Навасёлкаўскі сельсавет).

Задума даволі простая і не патрабуе асаблівых фінансавых укладанняў. «Гэта зусім не складана, і гэта па сілах чалавеку. Нам з вамі, дарагія чытачы», – гаворыцца ў публікацыі раёнкі. Заклік зберагчы і прымножыць гісторыю не толькі быў пачуты, але і ўжо ўвасабляецца. Як паведаміў начальнік раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя С. Баргамон, у кастрычніку былі сабраныя жалуды ад «ажэшкаўскага дуба». Праз пэўны час іх перасадзяць у спецыяльныя гадавальнікі і вырасцяць маладзенькія дубкі, з якіх пасля ўтвораць алею ці сквер. Можна не сумнявацца, што алеі Элізы Ажэшка быць!

Пройдуць гады, і нашыя нашчадкі будуць адпачываць пад разгалістымі кронамі дубоў «з радаводам» і пад шорах лісця слухаць расказы пра мінулае, у якіх абавязкова знойдзецца месца і аповеду пра Элізу Ажэшка і калісьці пасаджаны ёю ў фальварку дуб.

Мікалай ГЛЕБ,
в. Падлессе Ляхавіцкага раёна

На тым тыдні...

✓ **З 9 па 12 лістапада** ў Старой Русе (Наўгародская вобласць Расіі) прайшоў **фестываль камерных спектакляў паводле твораў Фёдара Дастаеўскага**, прымеркаваны да 189-годдзя з дня нараджэння пісьменніка. Удзельнічалі тэатры і акцёры з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Вялікага Ноўгарада, Вільні, Мінска і Полацка. Галоўныя прызы дасталіся монаспектаклю акцёра Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага (г. Мінск) Валерыя Шушкевіча «Достоевский вопрос», які прызнаны лепшай пастаноўкай. Акрамя гэтага, В. Шушкевіч атрымаў прыз за лепшую мужчынскую ролю. Яшчэ некалькі тэатральных калектываў і акцёраў былі адзначаныя адмысловымі прызамі.

✓ З нагоды 90-годдзя драматурга, народнага пісьменніка Беларусі Андрэя Макаёнка **12 лістапада** ў Музеі гісторыі беларускага кіно прайшоў **паказ сатырычнай камедыі «Рагаты бастыён»**. Гэтая экранізацыя п'есы «Лявоніха на арбіце» (1964 г., рэж. Пётр Васілеўскі) – першая каляровая шырокафарматная стужка кінастудыі «Беларусьфільм», яна сталася надзвычай злабадзённай для свайго часу, таму па-сапраўднаму выйшла на экраны толькі ў 1975 г. Дэманстрацыя папярэднічала адкрыццю выстаўкі кінаплакатаў да стужкі.

✓ **18 лістапада** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылася **выстаўка «Няскончаная п'еса для механічнага шыла»**. На ёй выстаўленыя... швейныя машыны. Арганізатарамі выступілі гістарычны музей і Беларускі саюз дызайнераў пры ўдзеле прыватных калекцыянераў Сяргея Шылы, Паўла Статкевіча і Змітра Сурскага. Пад час адкрыцця прайшоў паказ мадэляў студэнтаў Інстытута сучасных ведаў і выступленне гурта «Нагуаль». На выстаўцы, якая прадоўжыцца да 1 снежня, можна даведацца пра асноўных вытворцаў швейных машын XIX і XX стст., пабачыць спадарожныя атрыбуты краўцоў – манекены, нажніцы, прасы, тэкстыль ды інш. Арганізатары адзначаюць, што выстаўка – імкненне не прапусціць той момант, калі машынка ўжо губляе свае ўтылітарныя функцыі і ператвараецца ў аб'ект эстэтычнай асалоды, але яшчэ звязваецца з успамінамі маленства, з сямейнай памяццю.

✓ У віленскім Цэнтры сучаснага мастацтва **18 лістапада** прайшло **адкрыццё выстаўкі «Дзверы адчыняюцца? Беларускае мастацтва сёння»**. Гэта першая на сёння прэзентацыя сучасных беларускіх мастакоў у Літве. Дэманструюцца працы Артура Клінава, Руслана Вашкевіча, Алены Давідовіч, Уладзіміра Цэслера і Сяргея Войчанкі.

Зварот Полацкага зямляцтва і Беларускага фонду культуры

У XII стагоддзі (каля 1159 года) на беразе Палаты ў Полацку была пабудаваная знакамітая Спаская царква Ефрасіннеўскага манастыра – унікальны помнік Полацкай школы дойлідства. Сцены і слупы знутры былі распісаныя непаўторнымі фрэскамі, якія захаваліся да нашых дзён. Мастацтва полацкіх фрэсак нагадвае жывапіс Ноўгарада і Кіева і звязанае з візантыйскай традыцыяй. Але гэта і высокае самабытнае мастацтва Полацкай зямлі.

Зараз фрэскі знаходзяцца на рэстаўрацыі.

Мы звяртаемся да тых, хто жадае ўнесці свой уклад у рэстаўрацыю і захаванне гэтага непаўторнага цуду старажытнарускага насценнага роспісу, пераводзіць свае дабрачынныя ахвяраванні на рахунак Грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры»:

Р/с 3015741330015 в отд. № 539 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», код 739 (на реставрацию фресок).

Ад Полацкага зямляцтва
Старшыня – пісьменнік і журналіст ***Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ***

Ад імя Беларускага фонду культуры
Старшыня ***Уладзімір ГІЛЕП***

На наш зварот ужо адгукнуліся:

Бароўскі Барыс Бенядзіктавіч, г. Маладзечна
Валаховіч Ніна Фёдараўна, г. Мінск
Кашпар Андрэй Георгіевіч, г. Мінск
Крывашэева Ганна Мікітаўна, в. Скаўшын
Ліцкевіч Якаў Сяргеевіч, г. Ляхавічы
Новікава Таццяна Анатольеўна, г. Гомель
Поразава Лідзія Іванаўна, г. Мінск
Фёдарава Людміла Фёдараўна, г. Магілёў.

Дзякуем усім дабрадзеям і чакаем новых паступленняў!

«Берагіня» і ЮНІСЕФ

У Мінскім палацы культуры і спорту чыгуначнікаў 13 лістапада адбылася прэзентацыя Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня». Яна пачалася з круглага стала, на якім быў падняты шэраг пытанняў і праблемаў, што замінаюць далучэнню дзяцей, падлеткаў і юнакоў да карэннай культуры свайго краю.

Далучэнне дзяцей да гісторыка-культурных каранёў Бацькаўшчыны праз знаёмства з творамі вуснай народнай прозы з'яўляецца адной са стратэгічных мэтаў «Берагіні». Тут вельмі дарэчы і рэалізаваны напрыканцы гэтага года Дзіцячым фондам ААН ЮНІСЕФ праект выдання народных казак для дзетак на роднай мове, адабраных са збораў фальклярыстаў. Ідэя кнігі належыць вядомаму збіральніку песеннага фальклору і музыку, знанаму ў галіне фолк-року, – Алегу Хаменку. У выніку дзесяцігадовай працы ў 2007 годзе ім запісаны дыск з 70 народнымі казкамі. У працяг, пры падтрымцы Дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ, выйшла кніга з 19 дзіцячымі казкамі, з якіх чатыры запісаў сам Хаменка.

У кнізе таксама змешчаныя (толькі чамусьці на рускай мове!) каментары псіхолага да кожнай казкі і ілюстраваны пералік правоў дзіцяці паводле Канвенцыі аб правах дзіцяці, прынятай у 1989 годзе. Ілюстрацыі зробленыя ў традыцыйнай беларускай манеры беларускай мастачкай Юліяй Рудніцкай. Прадмову да кнігі напісаў прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ у Рэспубліцы Беларусь Юрый Аксамітны. Мае кніга і дадатак – CD, на якім запісаныя ўсе казкі, агучаныя А. Хаменкам.

«Жаніцьба Коміна» (выконвае гурт «Міжрэчча» з в. Пагост Жыткавіцкага раёна)

Дарэчы, на прэзентацыі кнігі, што адбылася 17 лістапада ў Нацыянальнай бібліятэцы ў рамках тыдня дзіцячага Еўрабачання і напярэдадні Дня абароны дзяцей (20 лістапада, у дзень, калі была прынятая Канвенцыя аб правах дзіцяці), Ю. Аксамітны падкрэсліў важнасць выхавання дзяцей у традыцыях сваёй нацыянальнай культуры і менавіта на роднай мове. Бо калі дзіця будзе адарванае ад культуры свайго краю, яно ўжо дарослым не здолее асэнсаваць усю разнастайнасць сусветнай культуры і зразумець іншыя народы. Ён паведаміў, што кніга будзе перададзеная ў штаб-кватэру ААН у Нью-Ёрку і ўсе регіянальныя прадстаўніцтвы ЮНІСЕФ, каб пазнаёміць іншыя краіны з нашай традыцыйнай культурай.



А. Хаменка

На прэзентацыі выступіла зорка опернай сцэны Марыя Гулегіна. Яна падзялілася сваімі ўражаннямі пра Беларусь і змены, што адбыліся за 12 гадоў пасля яе ад'езду з Мінска. І падзякавала Дзіцячаму фонду за цудоўную кнігу, што будзе настольнай і для яе маленькага сына.

З нагоды знакавай падзеі дырэктару НББ Раману Матульскаму быў уручаны памятны знак ЮНІСЕФ. Кіраўнік бібліятэкі звярнуў увагу прысутных, што распачатая тут традыцыя прэзентацыі лепшых айчынных кніг працягваецца і падкрэсліў, што «ніякія сучасныя камп'ютарныя стралялкі і страшылкі не здольныя даць дзіцяці тое, што яно атрымае ад добрай дзіцячай кнігі, асабліва прачытанай яму на роднай мове матуляй».

Увесь тыраж кнігі (2 500 асобнікаў) будзе перададзены дзіцячым бібліятэкам Беларусі. У продажы гэтага выдання не будзе.

Дарэчы, «казачны» праект, распачаты А. Хаменкам, працягнуўся 24 лістапада ў вядомым мінскім клубе бардаўскай песні «Лісіная нара». На гэты раз музыка прадставіў казкі для дарослых у сваёй праграме «Казачная акустыка». З прыкладу дзейнасці аднаго энтузіяста бачна, чаго можна дасягнуць у сферы далучэння жыхароў краіны да роднай культурнай спадчыны, калі працаваць мэтанакіравана.

С. АЛАВЕЙКА
Фота аўтара

Традыцыі і сучаснасць

Кабзар – як паэт, спявак і мастак

Алег Кабзар «12 сноў...», Bielsk-Podlaski, 2009, «GM Records»

Неяк летась, пад час агульнакраёвых прэзентацыяў кнігі «222 альбомы беларускага року», давялося мне пабачыць у гродзенскім музычным шапіку незвычайны дыск з новымі для мяне рэквізітамі: «Алег Кабзар "12 сноў..."». І артыста такога ў нас ніхто не ведае, і выдавец нейкі незвычайны – не «БМАgroup», не «West Records» ці «Каўчэг», а тыраж быў відавочна не самапальны, а фірменны, прамысловы. Я тады так і не наважыўся парадаваць сябе цікавым фанаграфічным адкрыццём, аб чым не раз шкадаваў потым; аж вось лёс падкінуў яшчэ адзін шанец – ужо ў Мінску, калі ў верасні польскі сайт «Беларуская інтэрнэт-бібліятэка» праводзіў у мінскай мастацкай галерэі «Ў» маштабную акцыю да свайго 10-годдзя (з выступленнямі артыстаў і лекцыямі кіраўнікоў сайта, з дэманстрацыяй шэрагу ягоных літаратурных і музычных навінак). Быў там і згаданы альбом бельскага барда і мастака Алега Кабзара, які тут мог ужо прыдбаць кожны ахвочы.

Сёння ўсё ж ніяк нельга сказаць аб канчатковай смерці жанру бардаўскай песні хоць бы таму, што на многіх музычных святах меламаны пільна прыглядаюцца ў музычных шапіках да надта разнастайнага маскульт-зместіва, нярэдка перапытваючы, ці ёсць там штосьці меладычнае, глыбокапаэтычнае і лагоднае паводле настрою. І гэта ж усё, па сутнасці, пра бардаўскую песню, дзякуючы чаму не залёжваюцца на паліцах кружэлкі Шалкевіча, Цярэшчанкі, Сокалава-Воюша, Беланогай, абодвух Камоцкіх...

Дык вось Алег Кабзар таксама класічны бард, і не такі ўжо невядомы ў нас, бо інтэрв'ю з ім, фоткі ды некалькі песень змешчаныя на шырока распаўсюджаным дыску «Барды Свабоды». Дарэчы, тыя пяць песень – акурат і ёсць амаль паловай з ягоных 12 сноў гэтага альбома. А падмацункам барду ёсць надзвычай высокая паэзія – кумір беларускай моладзі ў Польшчы бабулька Надзея Артымовіч («Уцякаю», «Ад'язджаючым», «Паэты»), а за бортам складанкі засталіся і беластоцкі паэт Ян Чыквін («Ідў»), і наш агульны вялікі сучаснік Анатоль Сыс («Пошасныя»). Апошняга Алег, аказвацца, ведаў і асабіста, слухаў ягоныя вершы жыўцом яшчэ ў Гомелі ў 1994-м.

Мо, нехта ўжо напружыцца перасцярогай: што ж гэта за бард, калі вершы чужыя? Дык не хвалюйцеся – усё астатняе сваё: па-за названымі дадайце сюды «Квадрат вуліцы», «Блюз», «Каласы», «Бура», «Вецер».

А вось і найбольш характэрныя рыфмы самога Кабзара:

Стаю, ўпісаны ў вуліцы квадрат,
У перспектыве позіркаў і ценяў.
Гляджу наперад,
хоць лягчэй глядзець назад,
Але у аксіёмах не бывае зменаў.
Ляцяць лісты парабалай вятроў,
Парушваючы геаметрыі дакладнасць.
І ў гэтай дзіўнай неакрэсленасці зноў
Стаю і падсычаю стадных
думак зайздрасць.



Відавочны авангардызм метафараў барда не бянтэжыць і прыхільнікаў класічных традыцыяў, бо ў сваіх творчых эксперыментах Алег Кабзар зусім не адпрэчвае вобразы класічнай літаратуры. Напрыклад, нашага несмяротнага Уладзіміра Караткевіча, якога інтэрпрэтуе ўсё ж парадаксальна. Ну паспрабуйце хоць бы прыдумаць сваю мелодыю да ягонай песні «Каласы»:

Ой, высока-высока ў небе
жаўранак затрымаўся над полем,
Жніўную песню пяе.
Васількі нязносным блакітам
у золаце жыта ткуць арнамент
Стары, як свет. Як свет, стары!
Мільёнам агменьчыкаў
змроку вечара
глядзяць на мяне саромлівым
позіркам,
Як малое дзяўчо, каласы.
З пакорай ціхай жыццё
аддаюць золату смерці,
каб нарадзіцца ізноў,
Каласы пад сярпом тваім.

Цікава, што і мастацкай аздобай альбома стала жывапіснае палатно мастака Алега Кабзара «Сон» (1990).

Як расказваў на той бардаўскай складанцы журналіст і бард Зміцер Бартосік, «мастак і бард з Падляшша Алег Кабзар нарадзіўся ў Гомелі, вучыўся ў Беларускай акадэміі мастацтваў, дзе і пазнаёміўся з сваёю жонкай, дзяўчынай з Беластока, куды напрыканцы 1990-х гадоў і пераехаў». Па ўсім відаць, катастрофы ад замены Палесся на Падляшша не адбылося, нават наадварот, бо не давялося, як зямлячцы Вальжыне Цярэшчанка, дзесяцігоддзямі чакаць фанаграфічнага ўвасаблення свайго таленту. Дый сам бард Алег Кабзар не раз сцвярджаў сваю прыналежнасць не да грамадзянаў Беларусі ці Польшчы, а да грамадзянаў Палесся/Podlasia. А польскія беларусы дый сама творчая атмасфера там натхнілі Алега на сур'ёзны канцэптуальны бардаўскі рэліз працягласцю ў 46 паўнакроўных хвілінаў. Дапамагло барду не толькі польскае міністэрства культуры і адміністрацыя (не наша), але і ўсюдыіснае беларускае (не наша) «Радыё Рацыя», дзе не дажоўваюць адкіды сусветнага музычнага рынку, а намагаюцца самі ўдзельнічаць у культуратворчым працэсе. Вынікам гэтага працэсу і стаў поўнафарматны бардаўскі альбом бельскага Кабзара «12 сноў...», дзе ён праявіўся і як паэт, і як спявак,, і як мастак, і як гітарыст. Праўда, Алег Кабзар не абмежаваўся тут традыцыйным бардаўскім іміджам, запрасіўшы да студыйнай супрацы Марэка Кубіка (клавішныя і перкусійныя інструменты, падпеўкі), Эву Васілеўску-Савіцку (бубны), Караля Сыпыткоўскага (кантрабас), Тамаша Вітэка (труба) і Марэка Яраша (класічная гітара), што істотна ўзбагаціла бардаўскую аскетычнасць альбома. Гукарэжысурай і майстарынгам у беластоцкай «WEM Studio» займаўся ўсё той жа Марэк Кубік.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА,
музычны крытык

Справа гонару аршанцаў

Аршанскі музей У. Караткевіча

Зоршай звязаныя імёны многіх дзеячаў навукі, культуры і літаратуры. Але асаблівае месца ў гісторыі горада належыць У. Караткевічу. Усё створанае ім красамоўна сведчыць пра яго рэдкі талент, які даў беларускай літаратуры творы высокага мастацкага ўзроўню. А вобраз Радзімы для яго з'яўляецца скразным. Асаблівае месца ў творчасці пісьменніка належыць роднай Оршы. І для аршанцаў справай гонару з'яўляецца ўшанаванне імя знакамітага земляка – сімвала духоўнай культуры нашага народа.

Ідэя стварэння літаратурнага музея ўзнікла ў 1993 годзе. Тады ён меў назву «Нашыя славутыя землякі». На пачатковым этапе ставілася задача выявіць пералік асобаў, якія дасягнулі пэўнай вядомасці ў сваёй галіне дзейнасці і мелі дачыненне да горада Оршы і Аршаншчыны ўвогуле. Другой задачай быў аналіз гэтай інфармацыі і прапановаў па далейшым вывучэнні і адлюстраванні ў экспазіцыі.

Але на падставе сабраных матэрыялаў і па прапанове Саюза пісьменнікаў Беларусі было вырашана стварыць на радзіме У. Караткевіча літаратурны музей, прысвечаны яму. 10 чэрвеня 1998 года Аршанскім гарвыканкамам было зацверджана Палажэнне аб музеі У.С. Караткевіча. Для яго быў перададзены невялікі будынак па вуліцы Леніна, 26 – помнік архітэктуры пачатку XX стагоддзя. У канцы 1920–1930-х гадоў там месціўся радзільны дом, у якім і нарадзіўся будучы пісьменнік.

У аснову экспазіцыі пакладзены тэматычна-храналагічны прынцып. У структуры выдзеленыя тэматычныя раздзелы ў адпаведнасці з перыядызацыяй жыцця і творчасці У. Караткевіча, у якіх выразна выяўляюцца творчы і асабісты лёс пісьменніка, яго грамадзянская пазіцыя, найбольш значныя падзеі і асобы літаратурнага жыцця Аршаншчыны.

Музей У. Караткевіча ў Оршы

Асноўнымі экспанатамі музея з'яўляюцца дакументы, асабістыя рэчы пісьменніка, фотаздымкі, рукапісы, лісты, кнігі ды інш. Актыўным фонам служаць агульнагістарычныя матэрыялы, творы мастацтва, побыту, што адлюстроўваюць эпоху, атачэнне пісьменніка.

Экспазіцыя адлюстроўвае дзіцячыя гады пісьменніка (маюцца радавод У.С. Караткевіча, успаміны дзяцінства і згадкі пра эвакуацыю ў гады Вялікай Айчыннай вайны), юнацтва і пачатак творчасці (апавядаецца пра вучобу ў Кіеўскім Дзяржаўным універсітэце імя Т.Р. Шаўчэнкі і паступленне ў завочную аспірантуру КДУ, прадстаўленыя першы варыянт аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» і публікацыі першых твораў аўтара). Далей можна пазнаёміцца з яго настаўніцкай дзейнасцю ў вёсцы Лесавічы Тарашчанскага раёна Кіеўскай вобласці і ў аршанскай СШ № 8; а потым ідзе вучоба ў Маскве на Вышэйшых літаратурных курсах і Вышэйшых сцэнарных курсах. Асабістаму жыццю адведзенае асобнае месца: расповеды пра маці пісьменніка Надзею Васільеўну Грынкевіч (1893 – 6.12.1977), жонку Валянціну Браніславаўну Нікіціну, пра сяброўства з А. Мальдзісам, Р. Барадуліным, П. Драчовым, замежнымі літаратарамі, пра пісьменніцкую і грамадскую дзейнасць.

Яшчэ адзін раздзел называецца «Караткевіч і мастацтва» (у ім паказанае адлюстраванне творчасці пісьменніка ў музыцы і выяўленчым мастацтве і ягоныя жывапісныя партрэты, а таксама талент самога Караткевіча як мастака).

Прысутнічае ў экспазіцыі музея і вобраз роднага краю, горада Оршы, «зямлі пад белымі крыламі».

Комплексам матэрыялаў на тэму «Жыццё і творчасць У.С. Караткевіча» ствараецца вобраз пісьменніка-майстра, пісьменніка-патрыёта, пісьменніка-грамадзяніна, бескарыслівага чалавека, гуманіста, у якога творчая прынцыповасць спалучалася з сяброўскай вернасцю, самаадданасцю і працавітасцю.

Унутры экспазіцыі, як яе неад'емная частка, знаходзіцца навукова-даследчы цэнтр. Ён уключае навуковую бібліятэку, метадычныя матэрыялы, працоўнае месца даследчыка, абсталяванае камп'ютарнай тэхнікай. Гэта дае магчымасць працаваць у самой экспазіцыі і рабіць яе жывой, дзейнай, запатрабаванай. Тут можна сабраць, сістэматызаваць і пашырыць інфармацыйную і метадычную базу не толькі для вывучэння жыцця і творчасці У. Караткевіча, але й іншых пісьменнікаў Аршаншчыны, яе славутых людзей. У электронным варыянце можна будзе пазнаёміцца з матэрыяламі, што не ўвайшлі ў экспазіцыю музея, а гэта – палова сабранага.

Кабінет пісьменніка, створаны ў аршанскім музеі

На другім паверсе музея размешчаная зала зменных экспазіцыяў – выставачная галерэя, дзе праходзяць выстаўкі, прымеркаваныя да значных падзеяў і юбілеяў, выстаўкі мастакоў. Тут жа адбываюцца і розныя мерапрыемствы: літаратурныя гасцёўні, прэзентацыі, паэтычныя вечарыны, сустрэчы з цікавымі людзьмі, пасяджэнні літаратурнага аб'яднання «Дняпроўскія галасы» і іншыя. У склад выставачнай галерэі ўваходзіць асобны пакой, прадугледжаны для правядзення невялікіх камерных выставак і для заняткаў па музейнай педагогіцы.

У двары музея ёсць утульны паэтычны дворык, дзе праводзяцца мерапрыемствы ў цёплую пару. Улетку 2005 года ў ім падводзіліся вынікі літаратурна-мастацкага пленэру імя Язэпа Драздовіча, прысвечанага Уладзіміру Караткевічу.

Музей наш яшчэ зусім малады, пачаў прымаць наведнікаў з 1 лютага 2002 года. За гэты час яго наведалі амаль 25 000 чалавек. Гэта не толькі жыхары Аршаншчыны, да Уладзіміра Караткевіча прыязджаюць з розных куткоў Беларусі і замежжа. У нас пабывалі многія вядомыя пісьменнікі, мастакі, музыканты, навукоўцы, дзяржаўныя дзеячы. За гэты кароткі час музей Уладзіміра Караткевіча стаў сапраўдным культурным цэнтрам горада.

Вольга ПАШКОВІЧ,
г. Орша

Уладзімір Караткевіч і філасофскі камень[1]

Аднаго разу мой раўналетак украінскі пісьменнік Сергій Жадан распавёў пра сваё знаёмства з першым томам славутага «Уладара пярсцёнкаў» Толкіна, што толькі-толькі выйшаў па-руску. Я задумаўся, ці змог бы распавесці сваю гісторыю пра падлеткавае ўзрушэнне ад сустрэчы з выдатным творам літаратуры.

Ішоў 1989 год. Мне было 16. Я разгарнуў толькі што надрукаваны чацвёрты том васьмітомніка Уладзіміра Караткевіча з першай часткаю рамана «Каласы пад сярпом тваім». Уражанне было неймавернае. Я страціў пачуццё часу й апрытомнеў адно цалкам праглынуўшы томік. Але тут усё й скончылася. Пятага тома з працягам гісторыі трэ было яшчэ чакаць і чакаць. Святая прастата, я не даўмеўся тады знайсці іншае выданне рамана, а таму некалькі месяцаў жыў у прадчуванні свята. Якое пэўнага дня і напаткала ў мінскай кнігарні, цалкам узнагародзіўшы за чаканне... Мабыць, з такой нецярплівасцю сённяшнія дзеткі чакаюць чарговых кніжак пра Гары Потэра, а таксама іх экранізацыяў. А вось у маім жыцці такіх чаканняў цуду больш, на жаль, не здаралася ніколі.

Паспрабую вытлумачыць асацыяцыю Караткевіч-Толкін. Гаворка пра стварэнне новых мастацкіх сусветаў. Жыццяздольных сусветаў, якія ў выніку робяцца нечым большым, чым проста літаратурная фікцыя, ушчэнт абвяргаючы тэзу Арыстоцеля пра мастацтва, якое ёсць толькі перайманнем прыроды.

Некалі Францішак Багушэвіч прыдумаў Беларусь, выклікаў яе да жыцця, адгадаўшы яе імя і назваўшы па імені. Намацаўшы сутнасныя характарыстыкі беларускага героя. Такім гэты герой, відаць, быў – і такім застаўся ў нашым пісьменстве: панам сахі і касы; дурным, як варона; з крыўдаю на руках у крыві, на нагах у лапцях... Нездарма дзеткі, дагэтуль вывучаючы ўсё гэта ў школе на памяць, не хочуць быць такімі беларусамі і жыць у такой краіне.

Але існуе і суцэльна іншая Беларусь. Віртуальная краіна, якой, найхутчэй, ніколі і не існавала. Але гэта краіна, у якой хочацца пажыць, грамадзянства ў якой хочацца дамагчыся. Ідэальная Беларусь Уладзіміра Караткевіча, населеная шляхетнымі рыцарамі, сімпатычнымі прайдзісветамі, выпівохамі й вылівохамі, мужнымі патрыётамі, нацыянальна свядомымі арыстакратамі з паэтычнымі здольнасцямі... Няма чаго дзівіцца, што ўжо новае пакаленне маладых беларусаў займае чаргу па візу ў гэтую краіну.

Краіну, якая стала радзімай народа, што, як і хобіты, вынік з рамантычнай веры ў чалавека, з наіўнага і мудрага перакананння аўтара ў тым, што якім бы вялікім і трагічным ні выглядаў сусвет, якімі б малымі і бездапаможнымі ні выглядалі мы ў ім, аднак ад нас усё адно шмат залежыць. Нават ад хобітаў. Нават ад беларусаў.

Не варта здзіўляцца, што я параўноўваю рэальную нацыю з плёнам пісьменніцкай фантазіі, а пачынальніка жанру фэнтэзі – з аўтарам гістарычных раманаў. Фантазіі маюць уласцівасць здзяйсняцца – нездарма ж, калі верыць пагалосцы, вялікая колькасць «талкінутых» на пытанне пра нацыянальнасць адказвае «эльф». Што ж да беларускага фэнтэзі, то дыскусіі пра неабходнасць яго стварэння значна прыпазніліся. Беларускае фэнтэзі даўно існуе. Яго стваральнік – Уладзімір Караткевіч. З адным вельмі важным удакладненнем.

Сутнасная розніца паміж Караткевічам і яго англійскім калегам ёсць. Шчыры хрысціянін, Толкін сціпла ўхіліўся ад спаборніцтва з Творцам на зямлі, прыдумаўшы паралельную тэрыторыю са сваімі картамі і сваімі мовамі – туды цяпер масава ўцякаюць новаспечаныя «эльфы», аматары так званых ролевых гульняў. Караткевіч жа дзёрзка паставіў магічны эксперымент проста ў краіне, якую меў пад рукой, – і эксперымент аказаўся паспяховым. Зямля «пад белымі крыламі» караткевічаўскай магіі нарэшце з'явілася на палітычнай карце свету, а мова чым далей, тым болей пачала нагадваць фэнтэзійна-эльфійскую: сярод яе носьбітаў усё меней беларусаў Багушэвіча і ўсё болей гарадскіх інтэлектуалаў, якія надзіва падобныя да герояў Караткевіча.

Я ведаў і ведаю рафінаваных снобаў, якія цярпець не маглі й не могуць тэкстаў Караткевіча, называючы іх то плагіятам, то безгустоўшчынай. Напраўду, нескладана заўважыць, дзе наш аўтар «пакарыстаўся» творчасцю папярэднікаў. Скажам, верш «Калі паміраюць...» падазрона нагадвае Веліміра Хлебнікава, колькі сцэнаў з «Каласоў...» занадта блізка перагукаюцца з талстоўскімі, Балотныя Яліны раз-пораз так і цягне назваць Баскервіль-Холам, а прагляд фільма Бергмана «Сёмая пячатка» са знакамітаю шахматнай партыяй са Смерцю можа падпсаваць настрой не аднаму аматару «Ладдзі Роспачы». Але ўвесь фокус у тым, што ў шведскага рэжысёра чалавек (як яму і належыць) прайграе, тады як у Караткевіча здараецца немагчымае, здараецца цуд, здараецца яўнае махлярства – і перамога. А пераможцаў, як вядома, не судзяць – і чытачы ў захапленні. Так і з караткевічаўскім плагіятам.

Называючы іх то плагіятам, то безгустоўшчынай. Напраўду, нескладана заўважыць, дзе наш аўтар «пакарыстаўся» творчасцю папярэднікаў. Скажам, верш «Калі паміраюць...» падазрона нагадвае Веліміра Хлебнікава, колькі сцэнаў з «Каласоў...» занадта блізка перагукаюцца з талстоўскімі, Балотныя Яліны раз-пораз так і цягне назваць Баскервіль-Холам, а прагляд фільма Бергмана «Сёмая пячатка» са знакамітаю шахматнай партыяй са Смерцю можа падпсаваць настрой не аднаму аматару «Ладдзі Роспачы»

Абвінавачанне ў безгустоўшчыне, на першы погляд, не такое і беспадстаўнае. Бо эпоха сур'ёзнай міфатворчасці і выкліканне да жыцця цэлых краінаў і нацыяў, здавалася б, мінула разам з В. Скотам і Г. Сянкевічам. Таму і мастацкі арсенал рамантыкаў і пазітывістаў XIX ст. выглядае крыху анахранічна. Лакалізаваўшы сваё «Міжзем'е» на тэрыторыі рэальнай Беларусі, Караткевіч апынуўся на самай мяжы літаратурнага кічу, на якой удала балансуе, але часам і зрываецца: *«Гэта наляцела, як навала, і слабы чалавек не вытрымаў. Усё зліпося, закруцілася ў чырвоным кругавароце, і яна даравала мне нават боль...»* – такое ў XX ст. можа належаць адно масавай літаратуры, папяровым серыялам альбо постмадэрнісцкай іроніі.

Што ўжо казаць пра тое, як лёгка сапсаваць Караткевіча ў перакладзе, кампраметуючы «нашае ўсё» ў вачах замежнікаў. «Дубовый язык!» – не вытрымаў «Дзікавага палявання...» паруску мой знаёмы, пажылы яўрэй, выхаваны на Джойсе, Музілі і Борхесе. Яшчэ безнадзейней выглядаюць справы з экранізацыямі. Нядаўняя спроба паказаць фільм Рубінчыка, які за савецкім часам меў рэпутацыю «востраюжэтнага» і ледзь не «фільма жахаў», у дзіцячым летніку навучэнцам старэйшых класаў добрых, дарэчы, гомельскіх школаў скончылася тым, што да канца са 150 чалавек даседзелі два. Адным з іх быў я. (Лішне казаць, што «Уладар пярсцёнкаў» дэманстраваўся ў гэтым летніку з аншлагам.)

Чаму церпяць фіяска ўсе гэтыя экранізацыі, перайманні, наследаванні? У чым прычына таго, што немагчыма паўтарыць караткевічаўскага цуду ў ім самім зададзенай сістэме мастацкіх каардынатаў? У самой сістэме каардынатаў, якая парадаксальным чынам не пасуе нікому, апроч Караткевіча. Яшчэ раз нагадаю розніцу паміж ім і Толкінам: легендарны Прафесар, прыдумляючы свой свет, не канкураваў з Творцам на Ягонай тэрыторыі. Што да Караткевіча, звярніце ўвагу, з якой лёгкасцю ён парушае запаведзь і марна згадвае Божае імя. То павешаныя ў 1863 г. ім параўноўваюцца са сцягам волі, «якога й Богу нельга зняць», то ў яго «на Беларусі Бог жыве», то «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», то сам лірычны герой аказваецца літаральна ўкрыжаваным «за ўсе мільярды двухногіх». Перад намі чыста рамантычны комплекс творцы-дэміурга, які, да таго ж, не задаволены роляй «намесніка» і «пасярэдніка», а проста займае месца Творцы – у створаным самім сабою свеце. Аднак жа жыццяздольнасць прыдуманага творцам сусвету наўпрост прапарцыянальная яго любові да свайго твору. І тут ужо – альбо звышчалавечая мера любові, альбо ўся сістэма развальваецца, як картачны дамок.

Што і казаць, сітуацыя амаль безнадзейная, але хто ведае, можа, мы і атрымаем новую версію міфа пра Пігмаліёна, толькі ў якасці канчаткова ажылай Галатэі выступіць цэлая ідэалізаваная краіна, не кажучы ўжо пра яе мову і літаратуру. Прынамсі, літаратурная ноч, што заканамерна прыйшла на змену ўсім «прыцемкам» еўрапейскай культуры, яшчэ доўга не пагражае нам, запарукаю чаму апісаная тут шчаслівая здольнасць беларускага алхіміка ўсё, да чаго ён з любоўю дакранаўся, ператвараць у золата. У блакіт і золата дня.

Андрэй Хадановіч,
пісьменнік,
перакладчык

У Латвійскім этнаграфічным музеі пад адкрытым небам, А. Лойка з жонкаю Ліліяй, У. Караткевіч, М. Абала, В. Целеш (ліпень 1981 года)

Фота Сяргея ПАНІЗЬНІКА

[1] Паводле даклада, прачытанага на II Міжнароднай канферэнцыі па творчасці У. Караткевіча (Орша, 2005 г.).

На зямлі Баць Нга

Красаванне жывога слова Караткевіча, перастворанага на мовы свету, адчуў я і ў неверагодна далёкай краіне. Вясной 1988-га я, загадчык рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва», трапіў у В'етнам. Дэлегацыю кнігавыдавецкіх работнікаў узначальваў Ігар Лапцёнак – намеснік міністра інфармацыі Беларусі. У горадзе Гюз, цэнтры пародненай з Беларуссю правінцыі, былы савецкі аспірант Нгуен Дзін Нго сказаў, што сваёй дачушцы даў імя Баць Нга, што ў перакладзе азначае «Белая Русь». Вельмі многа паралеляў адшукаў ён у гісторыі двух народаў.

З Гюз я прывёз, акрамя сувеніраў ад Баць Нга, і танюсенькую кніжачку Караткевіча на в'етнамскай мове «Былі ў мяне мядзведзі». Яе надрукавала ў 1985 годзе на цьмянай рысавай паперы тыражом у 30 100 асобнікаў выдавецтва «Тхуан Хоа», з якім мы пачалі творчае супрацоўніцтва. Перакладчыкам з рускай мовы быў Нгуен Тханг Лонг. У тым жа 1985 годзе ў Ханоі выйшла кніга Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Калі б ён сам пабыў у Гюз, то, напэўна, здзівіўся б і гмаху касцёла сярод спецыфічнага для гэтай краіны гарадскога ландшафту, і аповеду Ленг Чонг Шама аб тым, што кожная дынастыя на працягу васьмі тысячаў гадоў, замацаваўшыся ва ўладзе, знішчала духоўную памяць папярэдняй. І толькі старажытны Гюз можна лічыць выключэннем. Успомніў бы Уладзімір з гэтай нагоды і Нясвіж, і Мір, і рэшткі мінулага ў роднай Оршы. А сваё прозвішча на вокладцы кніжкі ён павінен быў бы прачытаць аж у чатыры выдыхі: Ko-rot-ke-vich.

У маі 1989 года нашыя в'етнамскія сутворцы – дырэктар выдавецтва «Тхуан Хоа» Вьюнг Хонг і яго намеснік паэт Ле Чонг Шам – наведалі Мінск. Мы ім паказалі Хатынь, Курган Славы. В'етнамскія госці ўсклалі кветкі на магілу Караткевіча і пакінулі на надгробку тую самую кніжачку, выдадзеную на рысавай паперы. 22 мая Ле Чонг Шам напісаў у Мінску верш «Каля магілы» з прысвячэннем: «Караткевічу – беларускаму народнаму паэту». Ён сам зрабіў падрадкоўнік і перадаў мне разам з арыгіналам. У перастварэнні верш загучаў так:

Караткевіч!
На гэтай нязрушнай зямлі
Надгробак для вас узвялі:
Тут рысавыя каласочкі
Абняць вас і кветкі змаглі.
А мне вы паспелі зрабіць
Такое, што змог палюбіць
Крутыя аблокі над Мінскам,
Журботную выраю ніць.
З В'етнама паклікалі вы
І нас да сваёй муравы.

Узносіцца з ветрам
журботным
Ваш дух да святой сінявы.
З народнай,
прыроднай красы –
Два рысавыя каласы.
Усходы ад вашых зярнятаў
Відаць з-пад в'етнамскай
расы.

На надгробку ляжалі пшанічныя каласы. Але Караткевіч стаўся для в'етнамца сваім, родным, і паэт не змог не аздобіць апошні прытулак другога паэта сваім нацыянальным хлебаносным сімвалам.

Сяргей ПАНІЗЬНІК,
пісьменнік



«Бурштын з беларускай жывіцы»

Быў. Ёсць. Буду.
Таму, што заўжды, як праклятыя,
Жыву бяздоннай трывогай,
Таму, што сэрца маё распята
За ўсе мільярды двухногіх.

У. Караткевіч

Так Уладзімір Караткевіч азначыў сваю ролю ў літаратуры і жыцці. Мы ведаем яго як пісьменніка-сучасніка, але творы будуць жыць і ў сэрцах нашчадкаў. Я лічу, што гэта будзе сапраўды так, бо Караткевіч быў шчырым сынам сваёй зямлі, і ўся яго любоў да Радзімы знаходзіла выйсце ў творах. Ён цікавіўся гісторыяй сваёй зямлі і намагаўся наблізіць яе да людзей праз творы. Найбольш яго ўвагу прыцягвалі паўстанне 1863–1864 гг. і асоба Кастуся Каліноўскага. І гэта невыпадкова.

Маці пісьменніка звалі Надзея Васільеўна Грынкевіч. А ў гісторыі Рагачоўскага раёна вядомы Томаш Грыневіч, кіраўнік паўстання на Рагачоўшчыне. Ці то з-за падабенства прозвішчаў, ці з іншай прычыны (нашчадак паўстанца?), але вядома, што пісьменнік шукаў магілу Т. Грыневіча, якая, паводле ўспамінаў, была пазначаная дубовым крыжам. На жаль, не знайшоў... Але, на мой погляд, Караткевіч стварыў Томашу Грыневічу лепшы помнік, чым дубовы крыж – «Паром на бурнай рацэ». Сам Грыневіч, яго жонка – прыхільнікі поглядаў Каліноўскага – маюць такія ж рысы характару, як і сам славуты змагар за свабоду і незалежнасць простага люду.

У творах «Каласы пад сярпом тваім», «Кастусь Каліноўскі» ды іншых К. Каліноўскі выяўлены адукаваным, чыстым, поўным высакароднасці і энергіі чалавекам, які нёс у народ жар любові да Бацькаўшчыны, абапіраўся на просты люд. Я лічу, Каліноўскі для Караткевіча быў прыкладам у жыцці і творчасці. Ён так піша пра свайго куміра:

Але ён не кахаў нікога,
Бо занадта радзіму любіў.
Варты лепшага ў свеце кахання,
Рана скончыўшы мужны палёт,
Русы хлопец золкім світаннем
На высокі ўзышоў эшафот.
Плач людскі барабаны крыюць,
І ад пошчаку глухне зямля.
На высокую гордую шыю
Успаўзае змяёю пятля.

А «паром на бурнай рацэ» знаходзіцца ў Рагачове праз Дняпро. Наогул, гэтаму гораду прысвечана шмат твораў пісьменніка. Чаму менавіта гэты горад стаў крыніцай натхнення для пісьменніка? Як жыхар Рагачова, магу адзначыць, што дом дзядзькі Уладзіміра Караткевіча, у якім ён часта бываў і пісаў творы, знаходзіцца ў вельмі прыгожым месцы – на беразе ракі. Там пісьменнік адпачываў душою, там ён пісаў свае незвычайныя творы. Вядома, што менавіта тут напісаныя «Чазенія», «Віно дажджоў», тут пачаў працу над раманам «Каласы пад сярпом тваім». Возера Святое, з якога вынырнуў Гервасій Выліваха, таксама знаходзіцца ў Рагачоўскім раёне. Наогул, у нас два Святыя возеры, таму яшчэ трэба высветліць, якое з іх меў на ўвазе пісьменнік.

Караткевічаўскі дом пад клёнамі

А цяпер хачу працытаваць верш Караткевіча:

У векавечнай Бацькаўшчыне клёны
Нячутна пачынаюць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы,
На ціхі стаў, на гаць.

Мне здаецца, гэты верш напісаны пра клёны, што раслі перад домам дзядзькі пісьменніка. Сказаў «раслі», бо яшчэ год таму дрэвы ўзвышаліся над домам. Яны памяталі пісьменніка, які, магчыма, шукаў пад іх шатамі натхненне, ад дажджу і пякучага сонца хаваўся пад іх кронамі... Але сёння на іх месцы стаяць два сухія пні. Дрэвы спілавалі, бо яны перашкаджалі лініям электраперадачы. Я разумею, што гэта вельмі важная прычына, але мне здаецца, што можна было б пасадзіць непадалёк маладыя клёнікі – быццам нашчадкі старых дрэваў.

Творы Уладзіміра Караткевіча перакладзеныя на розныя мовы свету: рускую, украінскую, польскую, балгарскую, чэшскую, славацкую, англійскую, нямецкую, французскую, іспанскую, латышскую, літоўскую, эстонскую, в'етнамскую... Гэта значыць, што яны вядомыя ў свеце і знаходзяць прыхільнікаў творчасці не толькі ў Беларусі. Ды нашым суайчыннікам – і не толькі ім – лепей, па магчымасці, прачытаць творы ў арыгінале.

Караткевіч ніколі нікога не пакідаў абыякавым, бо ён такі і быў – просты, адкрыты, даверлівы... Сябар Уладзіміра Сямёнавіча Рыгор Барадулін бачыць пісьменніка так: *«Загадка Уладзіміра Караткевіча – гэта загадка буршытыну. Колькі стагоддзяў жывіцы беларускага духу, беларускага клёку, беларускага слова трэба было згушчацца ў самы цёплы і самы светлы камень, каб пасля са-грэць стылыя руіны нашае гісторыі, каб асвятліць ноч нашага падняволення, які цяжар і ціск давялося вытрымаць жывіцы беларускай жывучасці, каб стаць самым лёгкім каменем, які хочацца на сэрцы насіць, бо ён гоіць душу. Мы маем наскі, беларускі буршытын. Ён з беларускай жывіцы, з беларускага сонца. Ён трымае ўсмешку нашага сонца. У нас свой духоўны буршытын – Уладзімір Караткевіч, талісманны камень крывіцкае душы».*

Нельга не згадзіцца з гэтымі словамі. Караткевіч застанецца з намі, таму што ён такі, як мы, ён – частка нас, і заўсёды застанецца з намі ў сваіх творах і ў нашай памяці. Быў. Ёсць. Будзе!

Дзмітрый СІМАНАЎ,
вучань 11 «Б» класа гімназіі г. Рагачова

Пакой у доме Ігара Васільевіча Грынкевіча, дзядзькі У. Караткевіча, дзе жыў і працаваў пісьменнік

Асобы ўплывовыя і ахвярныя

Фрагменты жыццяпісу графаў Старжынскіх

(Заканчэнне. Пачатак у № 43)

Міністр унутраных справаў Расійскай імперыі

22 чэрвеня 1886 г. да дачкі Зыгманта Беніслаўскага і Марыі Юзэфы Зузанны Аўгусціны Філамены Беніслаўскай з Хамінскіх (1863 – 02.02.1938), унучкі Напалеона Франца Хамінскага, прыйшоў надомнік Віктар Андрэй Мар'ян Старжынскі, сын графа Віктара Старжынскага, маршалка шляхты Віленскай губерні, памочніка гродзенскага губернатара. Старжынскі Віктар Андрэй Мар'ян быў даволі ўплывовым чалавекам у Расійскай імперыі, з'яўляўся шамбялянам (1893), потым атрымаў малодшы прыдворны чын камер-юнкера расійскага двара, урэшце воінскае званне палкоўніка і пасаду міністра ўнутраных справаў Расійскай імперыі.

Малады гаспадар камароўскага маёнтка заняўся добраўпарадкаваннем сядзібы і развіццём фальварковай гаспадаркі. Да палаца дабудаваў два крылы, пад паўночным крылом абсталяваў кухню са сталовай і бар, з якога зрабіў лесвіцу проста да сябе ў спальню. У кабінеце меў багаты кнігазбор. Збудаваў вадзяны млын на два паставы, вялікую дрэваапрацоўчую майстэрню, механізмы якой прыводзіліся ў рух ад вадзянога кола, каруўнік, стайню, свінарнік, курнік, лазню, алейню, сушню, млячарню, бровар і інш. Мадэрнізаваў цагельню і ўвекавечыў сваё імя – змясціў на чарапіцах кляймо, якое расшыфроўваецца: «Віктар граф Старжынскі герба «Ліс». У 1897 г. выкупіў секвестраваны радавы маёнтак Страблю ў Бельскім павеце. Сачыць за гаспадаркай у фальварку наняў адміністратара Мечыслава Фляркоўскага, бо сам часта быў у службовых раз'ездах. Пастаянна ў Камарове жыла толькі графіня з дзецьмі.

У графа Віктара Старжынскага ад Марыі Беніслаўскай было трое сыноў: Мацей Міхал Геранім Казімір Віктар Мар'ян Ігнацы, Віктар Аўгуст Міхал Клеафас Мар'ян і Андрэй. У шляхты была традыцыя даваць дзецям па некалькі імёнаў. Графіня мела 5 імёнаў, яе сыны па 4–7 імені. Да ўсяго, графіня верыла ў забабоны і давала дзецям некалькі імёнаў, каб заблытаць злых духаў, якія прыносяць хваробы ды няшчасці, і так аберагчы нашчадкаў.

Мацей Міхал Геранім Казімір Віктар Мар'ян Ігнацы меў званне генерал-лейтэнанта, камандаваў дывізіяй, якая стаяла пад Варшавай. Калі 1 верасня 1939 г. пачалася нямецка-польская вайна, а 17 верасня ў Рэч Паспалітую ўступіла Чырвоная Армія, Віктар Старжынскі пабачыў безнадзейнае становішча сваёй узброенай дывізіі. Ён прапанаваў салдатам схаваць зброю і разысціся, чакаць зручнага моманту для барацьбы з агрэсарамі. Тым, хто не пажадаў раззбройвацца, прапанаваў ісці з ім разам. Пасля доўгіх блуканняў М. Старжынскі і частка яго дывізіі трапіла ў Англію. Аб гэтым расказваў яго саслужывец Антон Масцяніца з вёскі Пілімы, што на Астравеччыне.

Апошнім гаспадаром Камарова (да 1939 г.) быў Віктар Аўгуст Міхал Клеафас Мар'ян. Ён з 1934-га па 1939 г. быў прэзідэнтам шляхты Варшавы. У гэты час маёнтак быў пераабсталяваны пад пансіянат.

Самы малодшы Андрэй прынёс бацькам шмат клопату: гуляў у азартныя гульні, не хацеў вучыцца. Бацьку часцяком даводзілася ўладжваць праблемы сына. Ён аднойчы выказаўся: *«На Андрэя я патрацію столькі грошай, што такога балвана можна было б з золата вылепіць»*. Андрэй у 1932 годзе застрэліўся.

Графіня Марыя Старжынская

Пасля смерці графа Віктара Вацлава ў 1920 г. гаспадаром Камарова намінальна лічыўся старэйшы сын Мацей Міхал Геранім Казімір Віктар Мар'ян Ігнацы. Практычна маёнткам распараджалася графіня Марыя Старжынская, якая амаль увесь час жыла ў Камарове, а сыны прыязджалі толькі летам на адпачынак. Фурманам у графіні працаваў Франц Адамавіч Сінкевіч.

Каб пазбегнуць сялянскіх бунтаў з-за малазямелля, польскі ўрад вынес пастанову аб прымусовай парцэляцыі (распрадажы) панскіх зямель. Старжынскаму было прапанавана прадаць 200 гектараў зямлі ў фальварках Мілеўшчына, Запаліна, Падгужжа, Залесь і Дубовыя Кудры. У 1927 г. другая частка маёнтка, агульнай плошчай 121 га, была распарцэляваная на 17 кавалкаў.

У Вільні 2 лютага 1938 г. графіня Марыя Старжынская памерла. Калі картэж з труной нябожчыцы пад'язджаў да Камарова, уздоўж дарогі стаялі парабкі з паходнямі. Труну з памерлай паставілі ў фае палаца, а вакол развесілі яе любімыя асабістыя рэчы: уборы, паліто, сукенкі, капелюшы, парасоны; расклалі яе любімыя ўпрыгожанні: пацеркі, пярсцёнкі, завушніцы, кіёчкі, вееры і іншае. Чэлядзь спадзявалася, што, як гэта часта рабілі заможныя людзі, уборы памерлай будуць раздадзеныя бедным, але сыны зрабілі інакш: усе яе рэчы, як сямейную рэліквію, склалі ў куфар і замкнулі. Пахавалі Марыю Старжынскую на канстанцінаўскіх могілках у некропалі Хамінскіх справа ад увахода. Тут да нядаўняга часу стаяў дубовы крыж.

Калі ўвосень 1939 г. прыйшлі Саветы, прадстаўнікі Часовага Камітэта ўсе рэчы нябожчыцы разам з іншымі каштоўнасцямі забралі, інвентар і жывёлу раздзялілі паміж парабкамі і жыхарамі вёскі Куцькі, разабралі аранжарэі (шкло спатрэбілася на вокны), а іншыя будынкі прыстасавалі для патрэбаў МТС, школы механізацыі і жылля.

Іван ДРАЎНІЦКІ,
краязнаўца,
в. Камарова
Мядзельскага раёна

Назвы нашых вёсак

(Працяг. Пачатак у №№ 30–35, 39–43)

Л*а*ўкі – вёска за 17 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 3 км на паўднёвы ўсход ад Груздава. Назва паходзіць з балцкіх моваў: літоўскае *«laukas»* азначае *«поле»*.

Лаўр*ы*нава – хутар за 18 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 6 км на поўдзень ад Лучая, за 1 км на поўдзень ад возера Каменскае. Назва патранімічная, паходзіць ад імя Лаўрын – формы праваслаўнага кананічнага імя Лаўрэнцій. У Пастаўскім раёне сустракаецца прозвішча Лаўрыновіч.

Лаўц*ы* – вёска за 19 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 6 км на поўдзень ад Камаяў. У 1873 годзе вёска ў казённым маёнтку Камайскай воласці Свянцянскага павета. 16 сакавіка 2010 года рашэннем раённага Савета дэпутатаў ліквідаваная. Назва паходзіць ад прозвішча Лавец, якое ўтварылася ад мянушкі *«лавец» – «той, хто стала займаецца лоўляй каго-небудзь ці чаго-небудзь як промыслам»*. Відаць, уладальнік гэтай мянушкі меў добрыя здольнасці да такога роду дзейнасці. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы Лавец, Лоўчык.

Лашук*і* – вёска за 32,5 км на ўсход ад Паставаў, за 1 км на паўднёвы захад ад Казлоўшчыны, на правым беразе ракі Ласіцы. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча Лашук. Магчыма, у яе аснове ляжыць фіна-вугорскае *«laas» – «лес»*, з чаго вынікае, што *«лашук» – «лясны жыхар»*. Вёска і зараз знаходзіцца сярод вялікага лесу. У літаратуры сустракаецца версія, што прозвішча Лашук утворанае ад славянскага *«лошадь», «лошак» (конь)*. У Пастаўскім і Мядзельскім раёнах пашыранае прозвішча Лашук.

Л*е*скава – вёска за 13 км на поўнач ад Паставаў, за 1,5 км на ўсход ад Кураполля. У 1873 годзе знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва славянская, паходзіць ад асновы *«лес»*.

Л*і*паўка – вёска за 9,5 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 3 км на паўночны захад ад Навасёлак. Назва паходзіць ад слова *«ліпа» – «лісцевае дрэва сямейства ліпавых»*.

Л*і*пнікі – вёска за 4,5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, на правым беразе ракі Мядзелкі. У пачатку XX стагоддзя знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета. Назва паходзіць ад слова *«ліпнік» – «зараснік ліпавых дрэваў»*.

Ліс*і*цы – вёска за 20 км на ўсход ад Паставаў, за 2,5 км на паўднёвы ўсход ад Лучая на ўсходнім беразе возера Лісіцкае. У пачатку XX стагоддзя была ў Лучайскай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць ад прозвішча Лісіца, якое ўтварылася ад адпаведнай мянушкі, якую атрымаў чалавек за свае *«лісіныя павадкі»*. У Пастаўскім раёне ёсць прозвішчы Лісіца, Лісоўскі, Лісовіч, Лісіцкі.

Ліцв*і*нкі – вёска за 4 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 1 км на паўночны захад ад возера Загачча. У 1873 годзе была ў Ясеўскай воласці Свянцянскага павета. Назва – этнонім, паходзіць ад *«ліцвіны» – «этнічная і гістарычная назва жыхароў ВКЛ – беларусаў і літоўцаў»*. У Пастаўскім раёне ад гэтай асновы ўтвораны прозвішчы Літвін, Літвінёнак, Літвіновіч.

Л*о*гавінцы – вёска за 6 км на ўсход ад Паставаў, за 0,5 км на ўсход ад ракі Лучайкі. У 1873 годзе знаходзілася ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу. Назва паходзіць ад беларускага *«лог, логавіна»*, што азначае *«нізіна; шырокі і доўгі яр»*.

Л*о*дасі – вёска за 21 км на ўсход ад Паставаў на паўночным беразе возера Лодасі. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. Назва вёскі паходзіць ад наймення возера: у фіна–вугорскіх мовах: *«luodo» (kар.), «luoto» (фін.) – «астравок», «камяністая водмель», «lood» (эст.) – «маленькі камяністы астравок»*. Геаграфія пацвярджае такое тлумачэнне: на возеры знаходзіцца востраў, які складаецца з пясчана-камяністага матэрыялу.

(Працяг на стар. 8)

(Працяг. Пачатак на стар. 7)

Лопуці (Лапуці) – вёска за 19,5 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 4 км на паўднёвы захад ад Камаяў, за 1 км на ўсход ад возера Лодасі. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва, верагодна, паходзіць з фіна-вугорскіх моваў, дзе *«lap»*, *«lapos (венг.)* – *«кавалак зямлі; невялікая раўніна»*. Блізкае значэнне мае і літоўскае *«lopas»* – *«лапіна; кавалак зямлі»*.

Лоўкішкі – вёска за 6 км на паўночны захад ад Паставаў на беразе ручая. Назва паходзіць з балцкіх моваў: літоўскае *«laukas»* азначае *«поле»*.

Лугі – вёска за 22,5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы захад ад Дунілавічаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета. Назва паходзіць са славянскіх моваў, утварылася ад слова *«луг»* – *«сенажаць, пераважна заліўная, пакрытая шматгадовымі травяністымі раслінамі»*. Вакол вёскі сапраўды раскінуліся шырокія прасторы лугоў.

Лукашова – вёска за 14,5 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 7 км на паўднёвы захад ад Лучая. У 1873 годзе знаходзілася ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета. У 1905 годзе – вёска і засценак. Назва патранімічная, паходзіць ад каталіцкага польскага *Łukasz* або праваслаўнага кананічнага *Лука*, што азначае *«які нарадзіўся пры ўзыходзе сонца»*. Ад гэтага імя ў Пастаўскім раёне ўтварыліся прозвішчы *Лукашэвіч, Лукашонак, Лукашук*.

Луцк-Казлоўскі – вёска за 35 км на ўсход ад Паставаў, за 2 км на паўночны ўсход ад Казлоўшчыны. У пачатку XX стагоддзя была ў Луцкай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва, верагодна, паходзіць ад славянскага тэрміна *«лука»* ў значэнні *«заліў, затока»*. Першапачаткова паселішча ўзнікла на беразе возера Царкавішча, каля затокі, *«пры луцэ»*, пазней, за 2 км на захад, бліжэй да Казлоўшчыны, узніклі выселкі. Каб адрозніваць паселішчы, да назваў дадалі прыметнікі: Луцк-Мосарскі і Луцк-Казлоўскі.

Лучай – вёска за 18 км на ўсход ад Паставаў паміж азёрамі Лучай і Лісіцкае. Назва паходзіць ад наймення возера, якое ўтварылася ад геаграфічнага тэрміна *«лука»* – *«звіліна», «загін рэчышча»*. Гэтае слова ў блізкіх значэннях сустракаецца ў славянскіх, балцкіх і фіна-вугорскіх мовах.

Лынтупы (Лынтупы) – гарадскі пасёлак за 34 км на захад ад Паставаў на рацэ Лынтупцы. Упершыню ўпамінаецца пад 1385 годам. З сярэдзіны XIX стагоддзя – цэнтр воласці ў Свянцянскім павеце Віленскай губерні, маёнтак Юрыя Бішэўскага, нашчадкі якога валодалі ім да 1939 года. У пачатку XX стагоддзя пабудаваны двухпавярховы мураваны палац, закладзены парк. Ёсць версія, што назва складаецца з дзвюх частак і з'яўляецца балцка-фінскай: *«lyntu»* (фін.) – *«птушка», «upis»* (літ.) – *«рэчка»*. Разам атрымліваецца *«птушыная рака»* – такі сэнс мела назва ракі Лынтупкі. Іншая версія лічыць назву балцкай і выводзіць яе са спалучэння двух словаў: *«lynas»* – *«вяроўка, шнур»* і *«tupas»* – *«след, адбітак»*, што дае разам *«адбітак шнура»* – характэрнае аздабленне керамічнага посуду, які ў вялікай колькасці знаходзіцца ў старажытным курганным комплексе каля Лынтупаў.

Лявонавічы – вёска за 10 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5,5 км на паўночны ўсход ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета. У 1905 годзе былі Лявонавічы 1-я, 2-я і засценак. Назва паходзіць ад прозвішча *Лявонавіч*, якое ўтварылася ад імя *Лявон* – формы кананічнага праваслаўнага *Леонт, Леонтий*, што азначае *«леў»*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Лявонаў, Лявонавец, Левановіч*.

Лявонкі – вёска за 12 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 5,5 км на паўднёвы ўсход ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе засценак, уладанне Дзісько. Назва паходзіць ад імя *Лявон (Лявонка)* – формы кананічнага праваслаўнага *Леонт, Леонтий*, што азначае *«леў»*.

Ляхаўшчына – вёска за 31 км на ўсход ад Паставаў, за 8 км на ўсход ад Варапаева. Назва – этнонім, паходзіць ад слова *«лях»*, што азначае «паляк». На Пастаўшчыне сустракаюцца прозвішчы *Лях, Ляховіч, Ляхновіч*.

М

Мажэйкі – вёска за 6 км на паўночны захад ад Паставаў на паўночным беразе возера Мажэйкі. У пачатку XX стагоддзя была ў Ясеўскай воласці Свянцянскага павета. Назва паходзіць з балцкіх моваў ад прозвішча *Мажэйка*. У літоўскай *«mažas»* – *«малы»*, адкуль *«мажэйка»* – *«нізкарослы, невялікі чалавек»*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы *Мажай, Мажэйка, Мажаеў, Мажукін, Мажута*.

Макаршчына – вёска за 27 км на ўсход ад Паставаў, за 4 км на паўднёвы ўсход ад Варапаева паміж возерам Белае і ракой Чэртка. У 1873 годзе засценак ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, уладанне Тызенгаўза. Назва паходзіць ад імя *Макар*, якое з'яўляецца формай кананічнага праваслаўнага *Макарий*, што азначае з грэчаскай мовы *«шчаслівы, блажэнны»*. Вёска ўяўляе сабой па-сутнасці групу хутароў, што і падкрэсліваецца прасторавым суфіксам «-шчына».

(Працяг будзе)

Снежань

«Настаўніцкая газета», выданне асветнікаў Беларусі – 65 гадоў з часу выхаду ў свет.

6 – Барбара Радзівіл (1520–1551), каралева Польшчы і вялікая княгіня ВКЛ – 490 гадоў з дня нараджэння.

7 – Ялхоў Юрый Аляксандравіч (1940), рэжысёр, кінааператар, сцэнарыст, сярод працаў якога брэнды айчыннага экрана – тэлевізійныя і мастацкія фільмы «Прыгоды Бураціна», «Пра Чырвоную Шапачку», «Сын за бацьку», «Анастасія Слуцкая» і інш., уладальнік прызоў і дыпломаў за лепшыя аператарскую і рэжысёрскую працы на розных кінафестывалях – 70 гадоў з дня нараджэння.

8 – Аршанскі льнокамбінат, рэспубліканскае ўнітарнае вытворча-гандлёвае прадпрыемства, лідар лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці Беларусі і краін СНД (1930) – 80 гадоў з пачатку дзейнасці.

9 – Пракаповіч Ігар Міхайлавіч (1960, Паставы), пісьменнік, краязнаўца (даследчык Пастаўскага раёна), аўтар шэрага вучэбных праграмаў, многіх краязнаўчых і мастацкіх твораў, лаўрэат прэміі часопіса «Маладосць» (1993) – 50 гадоў з дня нараджэння.

10 – Рушчыц Фердынанд (1870, Валожынскі р-н – 1936), жывапісец, графік, тэатральны дэкаратар і педагог, творчасць якога звязаная з мастацкім жыццём Беларусі, Польшчы і Літвы – 140 гадоў з дня нараджэння.

10 – Арочка Мікола (Мікалай Мікалаевіч; 1930, Слонімскі р-н), пісьменнік, літаратуразнаўца, крытык, перакладчык – 80 гадоў з дня нараджэння.

15 – Судзілоўскі (псеўданім Русель) **Мікалай Канстанцінавіч** (1850, Магілёў – 1930), дзеяч міжнароднага рэвалюцыйнага руху, вучоны-філосаф, прыродазнаўца – 160 гадоў з дня нараджэння.

19 – Лемцюгова Валянціна Пятроўна (1935), мовазнаўца, патрыярх айчыннай тапанімікі, адзін з аўтараў слоўнікаў беларускай мовы, шматлікіх навуковых працаў па беларускай тапаніміцы, Старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі, сябра Тапанімічнай камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь – 75 гадоў з дня нараджэння.

20 – Альхімовіч Казімір (1840, Шчучынскі р-н – 1916), мастак, аўтар гістарычных палотнаў і серыі карцінаў па матывах творчасці А. Міцкевіча, адзін з удзельнікаў мастацкага аздаблення касцёла Св. Кацярыны ў Пецярбургу – 170 гадоў з дня нараджэння.

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

Пачатак у № 1 за 2003 год)

Куст – старажытны веснавы (позна-веснавы) абрад. Называўся таксама ваджэнне куста. Прымяркоўваўся да другога дня Сёмухі. Найбольш пашыраны на Піншчыне, захаваўся ў жывым бытаванні. Выконвалі дзяўчаты. Самую маладзенькую, прыгожую прыбіралі кустом: кляновымі, ліпавымі ці бярозавымі галінкамі верхам уніз, звязанымі ў аснове; на галаву надзявалі вянок. «Дзявочае войска» на чале з кустом па дзве ў рад (спачатку старэйшыя, потым падлеткі) абходзілі двары, спявалі куставыя песні, дзе велічалі куст, гаспадара, гаспадыню, іх дзяцей, жадалі добрага ўраджаю, здароўя. За песні атрымлівалі падарункі. Ваджэнне куста заканчвалася пасядзелкамі з песнямі і танцамі, сваімі прысмакамі.

Абрад куста генетычна звязаны з культамі продкаў і раслінаў.

Куставыя песні – від веснавых песень, якія выконваліся ў час вес навога земляробчага свята Сёмухі. Спяваліся пераважна на Палессі. Суправаджалі абрад ваджэння куста, што ўвасабляў жыватворныя сілы прыроды і быў нібыта здольны перадаваць іх зямлі, полю («Дзе куста вадзілі, там пшанічанька радзіла»), а таксама служыў сімвалам роду і сувязі са светам продкаў, ад якіх «залежаў» ураджай («Пакланіся кусту, то ён дасць хлеба лусту»).

Падзяляюцца на рытуальныя, закліналь ныя і велічальныя (хоць не заўсёды сустракаюцца ў чыстым выглядзе). Рытуальныя песні адлюстроўваюць галоўныя моманты абраду – паход дзяўчатак у лес, шэсце «дзявоцкага войска» на чале з кустом па вёсцы, віншаванне гаспадароў з доўгачаканым святам заканчэння веснавых працаў з просьбаю надарыці куст. Аграрныя закліналь ныя песні былі прызначаныя магічным шляхам забяспечыць добры ўраджай. Песні, прысвечаныя хлопцу і дзяўчыне, закліналі каханне, шчаслівы лёс. Матывы шлюбу і ўрадлівасці зямлі ў іх непарыўна звязаныя: куст не толькі жыватворна ўплывае на рост «сачавічанькі», але і надзяляе расліну чароўнай сілай – хто яе сарве, той знойдзе сабе пару. Велічальныя песні ўхваляюць «зеляненькі куст», куст роднай вёскі, узвышаюць удзельніцаў свята, «дзявоцкае войска», якое «ніхто не б'е, не ваюе», услаўляюць шчодрых гаспадароў.

Куфар, скрыня – драўляная ёмістасць, у якой хавалі тканіны, адзенне, бялізну і каштоўнасці; від мэблі. У ім збіралі пасаг маладой, а ў час вяселля перавозілі ў дом маладога. Вядомы з часоў позняга сярэднявечча як сховішча каштоўнай цэхавай маёмасці. Мелі выгляд масіўнай нізкай драўлянай ці металічнай скрыні з плоскім векам, часта па-мастацку акаванай, забяспечанай унутраным замком складанай канструкцыі. У магнацкіх і мяшчанскіх інтэр'ерах – вялікія, драўляныя, з акоўкай па кантах, фарбаваныя ў чорны ці зялёны колер. У сялянскім інтэр'еры пашыраны з XIX ст., замяніў кублы. Свае аздобаю вылучаюцца агоўскія, давыд-гарадоцкія, лідскія куфры і інш. Іх выраб часта набываў характар промыслу. З 1950-х гг. вытворчасць куфраў амаль спынілася.

Куфар (Гродзенскі раён, канец XIX ст.)

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Камунальная набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары дапісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 25.11.2010. Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/ 0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 1161. Тыраж 1190 асобнікаў.